А.Ставер. “Жураўлі на Палессе ляцяць…”Літаратурная песня. (6 клас, 2 чвэрць)

Мэты:даць пачатковае ўяўленне пра літаратурную песню, пра адметнасці літаратурных песень; выклікаць у вучняў эмацыянальны водгук на адну з песенных візітак Беларусі, створаную на верш А.Ставера, абудзіць патрыятычныя пачуцці; прааналізаваць аўтарскія перажыванні, выказаныя ў вершы, вучыць за словам бачыць мастацкі вобраз, спасцігаць аўтарскі настрой, адчуваць інтанацыю, разумець функцыянальную ролю тропаў у мастацкім тэксце.

Тып урока: вывучэнне новага матэрыялу.

Форма ўрока: урок-дыялог з элементамі разважання.

Апераджальныя заданні:

1.Падрыхтаваць малюнкі або раздрукоўкі з інтэрнэту на адпаведныя тэмы: выява жураўлёў  (знешні выгляд), жураўлі ў небе (форма кліну), жураўлі ў прыродзе (на лузе); 2.Трохкаляровая геаграфічная карта рэгіёнаў Беларусі (поўнач – сіні колер, цэнтральная частка – аранжавы, поўдзень – зялёны); 3. Паведамленні на тэму  “Палессе”, “Шэры жуpавель”, прачытаць верш А.Ставера “Жураўлі на Палессе ляцяць”

Ход урока.

1. Арганізацыйна-матывацыйны этап.

Настаўнік. Да сённяшняга ўрока вы падрыхтавалі міні-праекты на адпаведныя тэмы. Калі ласка, агучце свае думкі на працягу 3-5 хвілін ( спачатку працуем з малюнкамі, адзначаючы самае істотнае ў знешнім выглядзе жураўлёў, асяроддзі жыхарства,  форме адлёту-прылёту).

  

  


- Назавіце тэму сваіх праектаў? (Жураўлі, Палессе.)
- Давайце звернемся да тэмы сённяшняга ўрока (“Жураўлі на Палессе ляцяць”) і вызначым ключавыя паняцці (тут могуць быць розныя меркаванні, але ў выніку прыходзім да высновы – жураўлі, Палессе, жураўлі на Палессе ляцяць). Адказы афармляем у выглядзе табліцы.

| Ключавое паняцце (тэма) | Я бачу… | Я ўяўляю… | Я чую… |
|---|---|---|---|
| Жураўлі | | | |
| Палессе | | | |
| Жураўлі на Палессе ляцяць | | | |

Далей працуем з табліцай, *запаўняючы вертыкальныя калонкі*, выкарыстоўваючы свой вопыт, свае веды і адказы тых, хто працаваў з міні-праектамі.

| Ключавое паняцце (тэма) | Я бачу… | Я ўяўляю… | Я чую… |
|---|---|---|---|
| *Жураўлі*  | Буйную птушку сіня-шэрага колеру; шырокія крылы, доўгія ногі (цыбатыя), доўгую шыю; выцягнутую дзюбу. | Стомленую птушку (доўгая дарога), радасную птушку (прыляцелі дамоў). | Голас жуpавоў. |

| | | | |
|---|---|---|---|
| *Палессе*<br> | Рэгіён на поўдні Беларусі (зялёны колер карты), даўжыня прыкладна 500 км і шырыня да 200 км; лес мяжуе з балотам+рэкі. | Лес, ваду, балота, пяскі, траву, насякомых, птушак, розных жывёл. | Гукі насякомых, птушак, жывёл. |
| *Журавы на Палессе ляцяць*<br> | *Калі?* (ранняй вясной)<br>*Як ляцяць?* (клінам)<br>*Куды?* (дадому)<br>*Адкуль?* ( з выраю) | Наступіла вясна. | *Голас журавоў – курлыканне (іх песня ад радасці, што вярнуліся дадому).* |

Настаўнік. Сапраўды, голас журавоў мы асабліва востра адчуваем ранняй вясной ці восенню, калі жураўлі вяртаюцца з выраю або адлятаюць у далёкія краіны. Курлыканне журавоў – гэта іх песня. А словы з верша А.Ставера “Жураўлі на Палессе ляцяць” пакладзены на музыку Ігарам Лучанком, і гэта таксама песня ў выкананні ансамбля “Песняры”. І гэта не проста песня, а гімн роднаму краю.

3. Гучыць песня. Праслухоўваем і робім першасны (эмацыянальны) аналіз.

- Чаму журавы (як і іншыя птушкі) кожную восень адлятаюць у вырай, а вясной вяртаюцца назад? (Наступаюць халады, і, каб пракарміцца, птушкі вымушаны шукаць корм у далёкіх краінах; з надыходам цяпла вяртаюцца назад.)
- Ці ўюць птушкі ў выраі гнёзды, каб вывесці птушанят? (Гнёзды ўюць, але ніколі не выводзяць патомства, выводзяць птушанят толькі на радзіме.)
- З чым у нас асацыіруецца вырай? І з чым – Палессе? Чаму птушкі “на Палессе ляцяць”? (Вырай – чужына, а Палессе – Радзіма, Бацькаўшчына; родны куток, куды заўсёды вяртаешся, бо ты тут нарадзіўся, тут твае карані.)

- Якія эмоцыі ўзнікалі ў нас у час гучання  песні? (Спачатку – высокая танальнасць і прыгажосць голасу выканаўцы кранае душу, пасля з'яўляецца зрокавае адчуванне карцін далёкага краю, і толькі затым – родныя краявіды,  усведамленне ролі родных мясцін у жыцці кожнага з нас, лейтматыву песні - "каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць".)
- Ці з'яўлялася ў вас калі-небудзь такое адчуванне, сугучнае лейтматыву песні? (Так, падарожнічаючы, заўсёды хочацца вярнуцца дадому; "у гасцях добра, але дома лепш".)

4. Павобразны аналіз твора.

Настаўнік. У беларусаў шмат песень у выкананні самых розных спевакоў, але песня "Жураўлі на Палессе ляцяць" з'яўляецца песеннай візітнай карткай нашай краіны, нашай Беларусі. Як вы думаеце чаму? (Слухаючы песню, адразу ўяўляеш наш родны край, які ён, якія людзі тут жывуць.)

- Давайце паспрабуем даказаць гэтае меркаванне, параўноўваючы  вобразы чужыны і роднага краю ў тэксце.

| Чужына | Родны край |
|---|---|
| "пагоды паўднёвыя", "пышны платанавы рай" | "далі сасновыя", "азёрны рабінавы край", "сакавітыя пожні мурожныя", "сцяжыначка родная", "прыветлівы двор" |

- Што супрацьпастаўляецца зялёнаму пышнаму раю? (Сосны, азёры, рабіны, травы, сцежкі, двор – усё тое, чым багата наша краіна, чым яна славіцца; тое, чым мы ганарымся: і прыгажосцю нашай прыроды, і прыветлівасцю нашага народа.)
- З якім пачуццём аўтар гаворыць пра родную зямлю? (З пачуццём гонару, пачуццём замілаванасці,  называе Беларусь "мілаю".)

- Якія сродкі мастацкай выразнасці выкарыстоўвае аўтар, каб паказаць замілаванасць родным краем? Якая іх роля? (Эпітэты; каб, акрамя замілаванасці родным краем, паказаць яго прыгажосць, утульнасць, прыветлівасць.)
- Якой паўстае чужына са слоў А.Ставера, якой яна нам бачыцца? (Проста паўднёвая краіна, дзе круглы год цёпла і многа зелені.)
- Чаму, па словах паэта, жураўлёў не прываблівае вечназялёны платанавы рай (або, другімі словамі, вечнае лета)? (Таму што "*клічуць* іх *далі* сасновыя і азёрны рабінавы *край*", "сакавітыя *пожні* мурожныя *не заменіш* нічым і нідзе" ; гэты рай – гэта не іх радзіма, яны не нарадзіліся тут; гэта не месца, знаёмае з дзяцінства.)
- Які мастацкі сродак выразнасці выкарыстоўвае пры гэтым аўтар? (Увасабленне, каб паказаць, што радзіма – гэта не кропка на геаграфічнай карце, а нешта зусім большае, тое, без чаго цяжка жыць.)
- Якія радкі пацвярджаюць меркаванне, што далёкая пышная краіна не дае нічога, як толькі перачакаць час халадоў? ("Што ім тыя пагоды паўднёвыя!Што ім пышны платанавы рай".)
- Як вы думаеце, што хацеў аўтар паказаць сваім вершам? У якіх строфах заключана асноўная думка твора? (Любоў да радзімы праяўляецца ў большай ступені, калі чалавек знаходзіцца далёка ад яе межамі, толькі на адлегласці пачынаеш любіць Радзіму так, як гаворыць А.Ставер; трэба цаніць сваю зямлю, бо другой такой – спакойнай, добрай, мілай і прыгожай зямлі нідзе больш няма; гэта зямля нашых продкаў, і мы павінны яе любіць; у 1 і 3 строфах заключана асноўная думка твора – "каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць".)
- Чым знешне адрозніваюцца 1 і 3 строфы? Якую ролю мае замена выразу "разумею цяпер / зразумееш тады, чаму з выраю жураўлі на Палессе ляцяць? (Замяніўшы дзеяслоў 1-ай асобы на дзеяслоў 2-ой асобы, аўтар акцэнтуе ўвагу на тым, што кожны з нас павінен усвядоміць ролю родных мясцін у сваім жыцці.)

- Што мы можам сказаць пра А.Ставера, аўтара вершаваных радкоў? (Зварот да крытычнага артыкула падручніка; нарадзіўся на Віцебшчыне ў прыгожым лясным краі – у вёсцы Маргавіца, што каля Бягомля; вершы пачаў пісаць яшчэ ў школе; дзяцінства прыпала на гады вайны.)
- Як вы лічыце, які жыццёвы факт у большай меры мог паспрыяць напісанню верша “Жураўлі на Палессе ляцяць”? (У гады вайны фашысты вывезлі А.Ставера ў канцлагер у Германію, і толькі пасля вайны ён змог вярнуцца дадому; сам верш быў напісаны ў мірны час пасля паездкі ў сонечную Грузію, тэма вяртання дадому заўсёды была актуальнай для аўтара.)
- Чым з’яўляюцца жураўлі, Палессе для Алеся Ставера? (Сімвалам Радзімы.)
- Чалавека, які любіць сваю Радзіму, мы называем.. (патрыётам). Ці можна журавоў лічыць патрыётамі свайго роднага краю? (Птушкі – самыя адданыя патрыёты сваёй зямлі; у г. Баранавічы Брэсцкай вобласці ўстаноўлены помнік вераб’ю з надпісам на пастаменце: “Да вас я назаўсёды прыляцеў: не вырай вабіць, а Радзіма”.)





- Чаму можна павучыцца ў птушак? (Адданасці і любові да Радзімы.)

5. Творчасць. Стварэнне воблака слоў “Жураўлі на Палессе ляцяць”.




Настаўнік. На мінулым уроку мы разглядалі песні, створаныя народам. А якой будзе песня, якая мае аўтара? (Аўтарская або літаратурная).

*Літаратурная песня* – песня, створаная на словы паэта.

6. Праца з табліцай "Адрозненне народнай песні ад літаратурнай" .

| | Аўтар | Спосаб перадачы | Мастацкія сродкі | Сюжэт |
|---|---|---|---|---|
| Народная песня | Народ+музыка | Вусная форма | Сталыя эпітэты, паўторы, метафары | Дух народа, яго мары і пачуцці |
| | Варыятыўнасць песень | Розная мелодыя | | |
| | | | Пытальныя і клічныя сказы, звароты | |
| Літаратурная песня | Аўтар+кампазітар | Пісьмовая форма | Эпітэты, метафары, параўнанні | Тое, што больш за ўсё цікавіць або трывожыць самога аўтара |
| | Адзін варыянт песні | Аднолькавая мелодыя | | |

7. Праца з крытычным артыкулам падручніка "Літаратурныя песні" і падрыхтоўка да кантролю па артыкуле.

8. Кантроль. Міні-віктарына “Літаратурныя песні”.

1. Чаму, па словах Н. Гілевіча, трэба заўсёды песню браць з сабою? (З песняй весялей жыць.)

2. Хто лячыў спевамі людзей? (Старажытныя індыйцы, тыбетцы, кітайцы, грэкі.)

3. Пад гучанне ліры або кіфары ў якой краіне паэты чыталі свае вершы? (У Грэцыі.)

4. Як раней у Беларусі называліся вандроўныя музыкі, якія выконвалі народныя песні? (Гусляры і лірнікі, дудары і цымбалісты.)

5. Назавіце самыя раннія літаратурныя песні. (Духоўныя, або царкоўныя.)

6. Хто з беларускіх паэтаў-песеннікаў лічыцца першым найбольш вядомым аўтарам? (Францішак Багушэвіч і Янка Купала.)

7. Хто такія паэты-песеннікі? (Паэты, якія пішуць тэксты для кампазітараў.)

8. Назавіце імёны беларускіх паэтаў-песеннікаў? (А. Русак, У. Карызна, А. Ставер, М. Багдановіч, Н. Гілевіч і іншыя.)

9. Назавіце імёны беларускіх кампазітараў? (І. Лучанок, У. Алоўнікаў, І. Любан, М. Равенскі.)

7. Падагульненне вынікаў урока. Рэфлексія.

Гульня “Аналогіі”. (Прапаную вучням падумаць, на што падобна тое, што вывучалася на ўроку; напрыклад, жураўлі – птушкі, вырай – поўдзень, песня – гукі, Палессе – лес, А.Ставер – паэт, песня жуpавоў – курлыканне, Палессе – Радзіма, вырай – чужына, Радзіма – далі сасновыя і г.д.)

8. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.

9. Каментарый пра дамашняе заданне. Выразнае чытанне верша “Жураўлі на Палессе ляцяць” на памяць.